Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся! 29 ЛІСТАПАДА 1935 ГОДА
№ 261 (2695)

# ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

ОРГАН ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТА І МЕНГАРКОМА ЛКСМБ

ВЫХОДЗІЦЬ ШТОДЗЕННА | ГОД ВЫДАННЯ XV | Цана 5 кап.

## Гутарка тав. Д. І. Валковіча з сакратарамі гаркомаў і райкомаў ЛКСМБ

Учора, 28 лістапада, сакратар ЦК КП(б)Б тав. **Д. І. Валковіч** прыняў сакратароў гаркомаў і райкомаў ЛКСМБ буйнейшых раёнаў рэспублікі. На прыёме прысутнічалі таксама сакратары ЦК ЛКСМБ тт. **Аўгустайціс** і **Стукалаў,** члены бюро і адказныя работнікі апарата ЦК ЛКСМБ.

Тав. Валковіч, падрабязна цікавячыся становішчам работы комсамольскіх арганізацый, падкрэсліў адставанне асобных участкаў комсамольскай работы, асабліва масава-выхаваўчай.

Сакратар Гомельскага гаркома ЛКСМБ тав. **Брагінскі,** сакратар Віцебскага гаркома ЛКСМБ тав. **Рагожкін** і іншыя комсамольскія работнікі, адказваючы на пытанні тав. Валковіча, расказалі над чым зараз працуюць комсамольскія арганізацыі.

Становішча палітычнай вучобы і асветы, азнаямленне комсамольцаў і моладзі з гісторыяй большэвіцкай партыі і рэвалюцыйнай барацьбой, стаханаўскі рух, развіццё маладзёжнай самадзейнасці, работа з дзецьмі і іншыя пытанні комсамольскай работы былі ўсебакова закрануты ў ажыўленай гутарцы тав. Валковіча з кіраўнікамі комсамольскіх арганізацый.

У заключэнне гутаркі тав. Валковіч выступіў з прамовай.